# ШТОМЕСЯЧНЫ АГЛЯД ЭКАНОМІКІ БЕЛАРУСІ

**№7 (58)**
**Ліпень 2007 г.**

- У ААН скасаваная пасада адмысловага дакладчыка па правах чалавека ў Беларусі.
- Беларусь выключылі з Абагульненай сыстэмы прэфэрэнцыяў.
- Дэфіцыт гандлю энэргетычнымі таварамі перавысіў USD 500 млн.
- Зьніжаная падаткавая нагрузка ў малых гарадах.
- Зацьверджаныя правілы выдачы экспартных крэдытаў.

**Насельніцтва: 9.71 млн чалавек**
**Прамысловасьць / ВУП: 27.6%**
**Сельская гаспадарка / ВУП: 7.5%**
**Інвестыцыі / ВУП: 24.3%**
**Экспарт: Расія 35%, ЭЗ 46%**
**Імпарт: Расія 59%, ЭЗ 22%**

## Палітыка: скасаваньне пасады дакладчыка па правах чалавека ў Беларусі

У чэрвені Рада ААН па правах чалавека прыняла рашэньне аб скасаваньні пасады адмысловага дакладчыка па Беларусі. Наяўнасьць дадзенага інстытута фактычна азначае прызнаньне на міжнародным узроўні праблем з захаваньнем правоў чалавека ў асобнай краіне. Рашэньне пра ліквідацыю гэтай пасады для Беларусі было прынята пераважна за кошт галасоў меньш разьвітых краінаў, пры гэтым ЭЗ і ЗША прагаласавалі супраць такога рашэньня. Такім чынам, ліквідацыя гэтай пасады не азначае ўсеагульнага прызнаньня захаваньня правоў чалавека ў Беларусі і паляпшэньне стасункаў з разьвітымі краінамі.

## Рэальны сэктар: рост прадукцыйнасьці працы перавысіў рост заробку

У студзені-траўні рэальны ВУП вырас на 9% г/г (8.7% г/г у студзені-красавіку). Паволны рост прамысловай вытворчасьці кампэнсаваўся бумам у будаўніцтве і гандлі. Удзельная вага гэтых двух сэктараў у ВУП вырасла ў параўнаньні з студзенем-траўнем 2006 г. на 1.1 і 2.2 адсоткавага пункта адпаведна. Асноўным фактарам росту ў будаўніцтве сталі інвэстыцыі, якія ў студзені-траўні вырасьлі на 20.9% г/г шмат у чым дзякуючы павелічэньню інвэстыцыйнага крэдытаваньня. Калі ў студзені-траўні 2006 г. удзельная вага крэдытаў у агульным аб'ёме інвэстыцыяў складала 16.3%, то ў бягучым годзе ён вырас да 20.9%. Такім чынам, інвэстыцыйная актыўнасьць прадпрыемстваў і рост ВУП усё ў большай ступені залежаць ад маштабаў банкаўскага крэдытаваньня.

Гандаль рос дзякуючы спажывецкаму буму, абумоўленаму зьніжэньнем схільнасьці да ашчаджэньняў і павелічэньнем даходаў (іншых чым заробак і сацыяльныя трансфэрты). У студзені-красавіку рэальны заробак вырас на 10.2% г/г (18.4% г/г у даляравым эквіваленьце), што значна меней, чым у 2006 г. (17.6 і 26.1% г/г адпаведна). Тэмп прыросту прадукцыйнасьці працы (19.1% г/г у даляравым эквіваленце) упершыню пасьля 2003 г. перавысіў тэмп прыросту заробку. Такім чынам, урад спыніў фарсаваньне росту заробку, што можа прывесьці да згасаньня спажывецкага буму.

**Дынаміка рэальнага ВУП**




Крыніца: Міністэрства статыстыкі і аналізу. Прагноз на 2007 г. – Дасьледчы цэнтр ІПМ.

## Структурныя тэндэнцыі: выключэньне Беларусі з Абагульненай сыстэмы прэфэрэнцыяў

**Гандлёвая палітыка.** У чэрвені Эўрапейская камісія пацьвердзіла прынятае раней рашэньне аб выключэньні Беларусі з Абагульненай сыстэмы прэфэрэнцыяў (АСП) з 21 чэрвеня 2007 г. Удзел у АСП даваў магчымасьць карыстацца палёгкамі пры экспарце шэрагу тавараў у ЭЗ. Найбольш рэалістычнай ацэнкай магчымых стратаў для Беларусі зьяўляецца лічба USD 23–36 млн на год, што значна меней прыведзеных некаторымі экспэртамі і ўрадам ацэнак (USD 200–400 млн). Паколькі Беларусь наўрадці зможа

Дасьледчы цэнтр ІПМ

Нямецкая эканамічная група ў Беларусі

220088 г. Мінск, вул. Захарава, 76
Тэл./факс +375 (17) 210 0105
Электронная пошта bmer@research.by
Вэб-сайт http://research.by/

Пераклад на беларускую мову ажыццяўляецца пры падтрымцы часопіса "Новая Эўропа", http://n-europe.eu/

© Дасьледчы цэнтр ІПМ, 2007

зьмяняць цэны тавараў, якія экспартуюцца ў ЭЗ, гэтыя страты выявяцца праз зьмяньшэньне прыбытку ці заробкаў на адпаведных прадпрыемствах.

### Вонкавы гандаль: дэфіцыт гандлю энэргетычнымі таварамі перавысіў USD 500 млн

У студзені-красавіку дэфіцыт гандлю таварамі дасягнуў USD 1127 млн (USD 391 млн у папярэднім годзе), паколькі тэмпы росту імпарту (21.8% г/г) па-ранейшаму значна перавышалі тэмпы росту экспарту (10.3% г/г). Пры гэтым рост агульнага кошту экспартаваных тавараў быў выкліканы выключна ростам сярэдніх экспартных цэнаў (10.7% г/г) пры зьніжэньні фізычнага аб'ёму паставак (0.4% г/г).

Вырашальны ўплыў на дынаміку экспарту мелі праблемы з пастаўкамі нафты і нафтапрадуктаў. Урад пакуль яшчэ ня здолеў дамагчыся аднаўленьня аб'ёмаў перапрацоўкі нафты і экспарту нафтапрадуктаў на ўзроўні 2006 г. Экспарт нафтапрадуктаў зьнізіўся ў параўнаньні з студзенем-красавіком 2006 г. на USD 205.1 млн. Пляны Белнафтахіму прапанаваць на вонкавых рынках ў 2007 г. 1.3 млн тон сырой нафты, здабытай у Беларусі, таксама знаходзяцца пад пагрозай, паколькі экспарт беларускай нафты быў цалкам спынены з-за праблемаў з вывазам нафты трубаправодным транспартам. Кошт экспарту сырой нафты ў параўнаньні з студзенем-красавіком 2006 г. зьнізіўся на USD 226.3 млн. У выніку дэфіцыт гандлю энэргетычнымі таварамі склаў USD 504 млн, у той час як у студзені-красавіку мінулага году назіраўся прафіцыт у памеры USD 61.5 млн. Улічваючы, што нафтаперапрацоўка ў Беларусі застаецца маларэнтабельнай (2.5% у параўнаньні з 27.5% у студзені-красавіку 2006 г.), стымулы для павелічэньня экспарту нафтапрадуктаў у бліжэйшы час застануцца нязначнымі.

### Дзяржаўныя фінансы: зьніжэньне падаткавай нагрузкі ў малых гарадах

У студзені-красавіку даходы кансалідаванага бюджэту дасягнулі 53.7% ад ВУП, што на 2.3 адсоткавага пункта вышэй, чым у студзені-красавіку 2006 г. Выдаткі зьменшыліся на 1.4 адсоткавага пункта ў параўнаньні зь мінулагоднім узроўнем і склалі 47.3% ВУП. У красавіку, аднак, выдаткі перавысілі даходы на 2.7% ад ВУП. Тым ня менш, па выніках студзеня-красавіка прафіцыт бюджэту склаў 6.4% ад ВУП, што значна вышэй за мінулагодні паказьнік (2.8% ад ВУП).

Існы ўзровень падаткавай нагрузкі (больш за 50% ад ВУП) зьяўляецца сур'ёзнай перашкодай для функцыянаваньня бізнэсу. Для стымуляваньня разьвіцьця прадпрыемстваў у малых гарадах урадам быў распрацаваны сьпіс з 138 такіх гарадоў і пасёлкаў, у якіх з 1 ліпеня дзейнічае спрошчаная сыстэма падаткаабкладаньня з зьніжанымі стаўкамі. Апроч таго, указам прэзідэнта для 346 буйных прадпрыемстваў, якія базуюцца ў малых гарадах, былі скасаваныя збор у рэспубліканскі фонд падтрымкі вытворцаў сельгаспрадукцыі і падатак з карыстальнікаў аўтамабільных дарогаў, а стаўка падатку на прыбытак была зьніжаная ў два разы. Дадзеныя захады будуць мець толькі нязначнае пазітыўнае ўзьдзеяньне на разьвіцьцё адпаведных прадпрыемстваў, бо доля названых падаткаў у супольных падаткавых плацяжах невялікая. Апроч таго, малаверагодна, што выкарыстаньне толькі падаткавых інструмэнтаў можа вырашыць праблему павышэньня канкурэнтаздольнасьці гэтых прадпрыемстваў.

### Манетарная палітыка: павелічэньне рэзэрвовых актываў

У траўні НББ выступіў нэта-пакупніком замежнай валюты на ўнутраным рынку. Такая сытуацыя склалася ў выніку

**ВУП і прамысловая вытворчасьць**




Крыніца: Міністэрства статыстыкі і аналізу.

**Выдаткі на вытворчасьць прамысловай прадукцыі**

| Студзень-кастрычнік 2007 г. | Удзельная вага, % | Зьмяненьне, % г/г |
|---|---|---|
| выдаткі, у т.л. | 100.0 | 24.5 |
| матэрыяльныя: | 46.3 | 24.8 |
| сыравіна і матэрыялы | 46.3 | 24.8 |
| набытыя камплектуючыя | 10.4 | 29.9 |
| паліва і энэргія | 15.1 | 45.2 |
| іншыя | 3.8 | 17.3 |
| аплата працы | 11.3 | 21.2 |
| адлічэньні на сацыяльныя патрэбы | 4.3 | 15.0 |
| амартызацыя | 4.3 | 29.1 |
| іншыя выдаткі | 4.5 | -13.7 |

Крыніца: Міністэрства статыстыкі і аналізу.

**Дынаміка знешняга гандлю таварамі**




Крыніца: Міністэрства статыстыкі і аналізу.

**Унесак таварных групаў у прырост экспарту і імпарту***

| Групы тавараў | Экспарт | Імпарт |
|---|---|---|
| Інвестыцыйныя | 46.1 | 25.0 |
| Энэргетычныя | -70.1 | 9.5 |
| Прамежкавыя неэнэргетычныя | 110.1 | 48.6 |
| Харчовыя | -0.3 | 3.2 |
| Спажывецкія нехарчовыя | 14.3 | 13.7 |
| Разам | 100.0 | 100.0 |

* Студзень-красавік 2007 г. да студзеня-красавіка 2006 г., %.

Крыніца: разлікі па дадзеных Міністэрства статыстыкі і аналізу.

абмежаваньня попыту на замежную валюту праз больш жорсткую грашовую палітыку на пачатку году. Таксама НББ і ўрад па-ранейшаму стымулююць прыцягненьне камэрцыйнымі банкамі вонкавых пазыкаў, што павялічвае прапанову замежнай валюты на ўнутраным рынку. Акрамя таго, у траўні павялічыліся дэпазыты ўраду ў замежнай валюце ў НББ. Таму ў траўні чыстыя замежныя актывы ВГКР павялічыліся на 7.2% м/м. Разам з тым, за кошт канцэнтрацыі падаткавых паступленьняў і іншых плацяжоў на рублёвых рахунках ураду ў НББ (рост на 10.5% м/м) адбываўся адток ліквіднасьці. У выніку ў траўні грашовая база павялічылася на 1.2% м/м, а ў гадавым вымярэньні яе рост паскорыўся да 28.0% г/г (24.7% г/г у красавіку).

Паводзіны банкаў ва ўмовах дастаткова высокага ўзроўню ліквіднасьці былі фактычна ідэнтычныя красавіцкім: у сувязі з высокім узроўнем крэдытнай запазычанасьці працягнулася паступовае згасаньне крэдытнага буму – у траўні тэмп росту крэдытаваньня эканомікі складаў 56.7% г/г (58.4% г/г у красавіку). Свабодныя рэсурсы камэрцыйныя банкі пераважна накіроўвалі на набыцьцё каштоўных папераў НББ. Апроч таго, у гэтай сытуацыі працягнулася зьніжэньне адсоткавых ставак на міжбанкаўскім рынку. На крэдытна-дэпазытным рынку адбылося толькі нязначнае зьніжэньне ставак, што, верагодна, тлумачыцца высокім узроўнем рызыкаў, што назьбіраліся ў банкаўскай сыстэме. У гэтых умовах насельніцтва зьнізіла попыт на наяўныя грошы, аб'ём якіх у траўні скараціўся на 2.9% м/м, а тэмп іх росту ў гадавым вымярэньні запаволіўся да 23.9% г/г (25.9% г/г у красавіку). Акрамя таго, упершыню за доўгі час тэмпы росту дэпазытаў у замежнай валюце перавысілі тэмпы росту дэпазытаў у нацыянальнай валюце. У выніку рублёвая грашовая маса павялічылася ў красавіку на 0.3% м/м, а шырокая грашовая маса – на 1.7% м/м. У гадавым вымярэньні тэмпы іх росту склалі адпаведна 27.7 і 28.6% г/г (29.4 і 29.7% г/г у сакавіку).

Спажывецкія цэны ў траўні выраслі на 0.4% м/м, а ў гадавым вымярэньні інфляцыя засталася на ранейшым узроўні, а менавіта 7%. Курс даляра ў чэрвені не зьмяніўся і на 30 чэрвеня склаў 2145 BYR/USD.

**Банкаўскі сэктар: зацьверджаныя правілы выдачы ільготных экспартных крэдытаў**

У чэрвені сумеснай пастановай ураду і НББ быў зацьверджаны парадак выдачы прадпрыемствам камэрцыйнымі банкамі ільготных крэдытаў для вытворчасьці экспартнай прадукцыі. У адпаведнасьці з дадзенай пастановай, каб атрымаць магчымасьць прэтэндаваць на атрыманьне ільготных крэдытаў пры вытворчасьці экспартнай прадукцыі, суб'екты гаспадаркі мусяць атрымаць ухваленьне іх бізнэс-пляну, а таксама абгрунтаваньне мэтазгоднасьці атрыманьня такога крэдыту ў дзяржаўных органах. Апроч таго, яны мусяць атрымаць згоду дзяржаўнай страхавой кампаніі на страхаваньне адпаведных экспартных рызыкаў. У выпадку ўхваленьня з боку дзяржаўных органаў адпаведныя экспартэры маюць права зьвяртацца ў камэрцыйныя банкі па ільготныя крэдыты: з адсоткавай стаўкай, роўнай палове стаўкі рэфінансаваньня для крэдытаў у беларускіх рублях, і ніжэй сярэднеўзважанай адсоткавай стаўкі – для крэдытаў у замежнай валюце. Страты адсоткавых плацяжоў банкаў мяркуецца кампэнсаваць напрасткі з дзяржбюджэту пры крэдытаваньні ў беларускіх рублях і праз залік пры аплаце банкамі падатка на прыбытак пры крэдытаваньні ў замежнай валюце. Дадзеныя захады выкліканыя ў першую чаргу негатыўнымі тэндэнцыямі ў вонкавым гандлі. Разам з тым, яны ўзмоцняць адміністрацыйную нагрузку

**Кансалідаваны бюджэт**




Крыніца: разлікі па дадзеных Міністэрства статыстыкі і аналізу.

**Грашовая база і ІСЦ**




Крыніца: разлікі па дадзеных НББ і Міністэрства статыстыкі і аналізу.

**Стаўка рэфінансавання**




Крыніца: разлікі па дадзеных НББ і Міністэрства статыстыкі і аналізу.

на банкі ў сувязі з выдачай такіх крэдытаў, павялічваючы дыспрапорцыі ў фінансавым сэктары краіны. Апроч таго, малаверагодна, што гэты іструмэнт істотна паспрыяе павышэньню канкурэнтаздольнасьці беларускага экспарту.

| **Эканамічныя тэндэнцыі** | | **2 кв. 05** | **3 кв. 05** | **4 кв. 05** | **1 кв. 06** | **2 кв. 06** | **3 кв. 06** | **4 кв. 06** | **1 кв. 07** | **сак. 07** | **кра. 07** | **тра. 07** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Рост рэальнага ВУП | % г/г | 8.4 | 8.7 | 10.7 | 11.0 | 9.6 | 8.6 | 10.8 | 8.4 | -- | -- | -- |
| Рост рэальнага ВУП | % г/г нар. | 9.1 | 9.0 | 9.4 | 11.0 | 10.3 | 9.6 | 9.9 | 8.4 | 8.4 | 8.7 | 9.0 |
| Рэальная прамысловая вытворчасьць | % г/г нар. | 10.3 | 9.7 | 10.5 | 13.5 | 12.6 | 12.2 | 11.3 | 5.9 | 5.9 | 6.7 | 7.7 |
| Рэальная сельскагаспадарчая вытворчасьць | % г/г нар. | 10.1 | 3.0 | 2.1 | 10.1 | 6.9 | 2.2 | 6.1 | 4.4 | 4.4 | 4.0 | 4.8 |
| ІСЦ | % г/г к/п | 10.0 | 9.8 | 8.0 | 6.8 | 7.0 | 6.4 | 6.6 | 8.1 | 8.1 | 7.0 | 7.0 |
| ІЦВПП | % г/г к/п | 12.1 | 10.5 | 10.2 | 8.3 | 8.1 | 8.0 | 8.5 | 11.6 | 11.6 | 12.9 | 13.9 |
| Экспарт тавараў (USD)* | % г/г | 17.2 | 15.1 | 11.5 | 27.5 | 24.9 | 29.3 | 13.6 | 6.3 | 13.4 | 22.5 | -- |
| Імпарт тавараў (USD)* | % г/г | 3.6 | 7.8 | -5.3 | 51.3 | 37.0 | 30.0 | 23.5 | 21.1 | 15.6 | 23.7 | -- |
| Сальда гандлю таварамі (дадзеныя НББ) | USD млн. нар. | 345 | 43 | -527 | -136 | -786 | -1215 | -2398 | -836 | -836 | -1127 | -- |
| Бягучы рахунак | USD млн нар. | 884 | 816 | 510 | 115 | -289 | -558 | -1512 | -641 | -641 | -- | -- |
| Бягучы рахунак | % ВУП нар. | 6.7 | 3.7 | 1.7 | 1.5 | -1.8 | -2.1 | -4.1 | -7.0 | -7.0 | -- | -- |
| Міжнародныя рэзервы | USD млн к/п | 1130 | 1189 | 1297 | 1290 | 1154 | 1155 | 1383 | 1565 | 1535 | 1565 | 1720 |
| Грашовая база | % г/г к/п | 39 | 50 | 74 | 53 | 48 | 38 | 20 | 22 | 22 | 25 | 28 |
| Стаўка па крэдытах у беларускіх рублях** | % гадавых, к/п | 15 | 14 | 12 | 12 | 11 | 12 | 12 | 13 | 14 | 13 | 13 |
| Абменны курс (афіцыйны) | BYR/USD с/п | 2151 | 2150 | 2150 | 2151 | 2146 | 2142 | 2141 | 2141 | 2143 | 2144 | 2145 |
| Абменны курс (афіцыйны) | BYR/EUR с/п | 2713 | 2623 | 2558 | 2587 | 2694 | 2729 | 2761 | 2805 | 2838 | 2889 | 2901 |

* тэмпы росту даляравых паказнікаў (крыніца: разлікі па дадзеных Міністэрства статыстыкі і аналізу).
** намінальная стаўка па новых крэдытах юрыдычным асобам (крыніца: НББ).
Крыніцы: Міністэрства статыстыкі і аналізу і НББ.

| **Асноўныя эканамічныя паказнікі** | | **2000** | **2001** | **2002** | **2003** | **2004** | **2005** | **2006** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Намінальны ВУП | BYR трлн | 9.134 | 17.173 | 26.613 | 36.565 | 49.991 | 65.067 | 79231 |
| Намінальны ВУП* | USD млрд | 8.7 | 12.1 | 14.5 | 17.7 | 23.1 | 30.2 | 36.9 |
| Рост рэальнага ВУП | % г/г | 5.8 | 4.7 | 5.0 | 7.0 | 11.4 | 9.4 | 9.9 |
| Прамысловая вытворчасьць | % г/г | 7.8 | 5.9 | 4.5 | 7.1 | 15.9 | 10.5 | 11.3 |
| Сельскагаспадарчая вытворчасьць | % г/г | 9.3 | 1.8 | 0.7 | 6.6 | 12.6 | 1.7 | 6.1 |
| ІСЦ | % г/г с/п | 168.6 | 61.1 | 42.6 | 28.4 | 18.1 | 10.3 | 7.0 |
| ІСЦ | % г/г к/п | 107.5 | 46.1 | 34.8 | 25.4 | 14.4 | 8.0 | 6.6 |
| ІЦВПП | % г/г с/п | 185.3 | 72.1 | 41.4 | 37.5 | 24.1 | 12.1 | 8.3 |
| ІЦВПП | % г/г к/п | 166.4 | 40.9 | 42.7 | 28.1 | 18.8 | 10.0 | 8.5 |
| Экспарт (т/п, USD) | % г/г | 19.4 | 10.9 | 9.8 | 24.4 | 35.7 | 15.8 | 21.8 |
| Імпарт (т/п, USD) | % г/г | 21.5 | 11.1 | 9.0 | 25.1 | 40.3 | 3.0 | 33.0 |
| Бягучы рахунак | USD млн | -338 | -394 | -311 | -424 | -1206 | 510 | -1512 |
| Бягучы рахунак | % ВУП | -3.9 | -3.2 | -2.1 | -2.4 | -5.2 | 1.7 | -4.1 |
| ПЗІ (чыстыя) | USD млн | 119 | 96 | 453 | 170 | 163 | 303 | 351 |
| Міжнародныя рэзервы | USD млн | 357 | 347 | 457 | 474 | 770 | 1297 | 1383 |
| Сальда дзяржбюджэту | % ВУП | -0.6 | -1.6 | -0.2 | -1.6 | 0.0 | -0.6 | 2.2 |
| Унутраны дзяржаўны доўг | % ВУП к/п | 4.5 | 6.1 | 5.4 | 5.5 | 5.7 | 5.8 | 6.5 |
| Знешні доўг (суцэльны) | % ВУП к/п | 24.4 | 24.8 | 27.0 | 23.7 | 21.4 | 17.9 | 18.6 |
| Грашовая база | % г/г к/п | 52 | 225 | 32 | 50 | 42 | 74 | 20 |
| Абменны курс (НББ) | BYR/USD с/п | 1035 | 1394 | 1784 | 2075 | 2160 | 2154 | 2145 |
| Абменны курс (НББ) | BYR/USD к/п | 1213 | 1580 | 1920 | 2156 | 2170 | 2152 | 2140 |
| Спрэд** | % с/п | 44.4 | 0.8 | 0.0 | 0.0 | 0.0 | 0.0 | 0.0 |
| Спрэд** | % к/п | 2.8 | 0.2 | 0.0 | 0.0 | 0.0 | 0.0 | 0.0 |
| Абменны курс (НББ) | BYR/EUR с/п | 651 | 1239 | 1690 | 2353 | 2684 | 2681 | 2692 |
| Абменны курс (НББ) | BYR/EUR к/п | 1097 | 1392 | 1989 | 2695 | 2956 | 2550 | 2817 |

* ВУП у даляравым эквіваленьце за 2000 гг. разлічаны па рынкавым (неафіцыйным) валютным курсе (крыніца: Дасьледчы цэнтр ІПМ).
** спрэд паміж безнаяўным курсам ценявога рынку і афіцыйным курсам (крыніца: Дасьледчы цэнтр ІПМ).
Крыніцы: Міністэрства статыстыкі і аналізу, Міністэрства фінансаў, НББ, Дасьледчы цэнтр ІПМ.

**Умоўныя азначэнні:**

| | | | |
|---|---|---|---|
| г/г | змены год да году | нар. | нарастаючым вынікам |
| ІСЦ | індэкс спажывецкіх цэнаў | НББ | Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь |
| ІЦВПП | індэкс цэнаў вытворцаў прамысловай прадукцыі | ПЗІ | простыя замежныя інвестыцыі |
| к/п | на канец перыяду | с/п | сярэдняе за перыяд |
| м/м | змены за месяц | трлн | трыльён |
| млн | мільён | ЭЗ | Эўрапейскі Зьвяз |
| млрд | мільярд | | |